# ГЕНУЭЗСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ 1922 ГОДА І РАЗВІЦЦЁ САВЕЦКА-ПОЛЬСКІХ АДНОСІН

В.М. Бароўская (Мінск)

Пачатак Генуэзскай канферэнцыі (10 красавіка – 20 мая 1922 г.) фактычна прыпыніў пасяджэнні савецка-польскіх гандлёвых перагавораў. Заключэнне Рапальскага дагавора, таксама негатыўная пазіцыя кіраўніцтва Францыі супраць актыўнага гандлёвага супрацоўніцтва з Савецкай Расіяй сталі прычынымі канчатковага спынення перагавораў у Варшаве. На Генуэзскай канферэнцыі планавалася вырашыць спрэчныя фінансава-эканамічныя пытанні. На першы план выступала праблема выплаты запазычанасцей часоў Расійскай імперыі, Часовага ўраду, Савецкай Расіі перад краінамі Антанты. Таксама ў цэнтр увагі трапіла пытанне эканамічнага ўзнаўлення Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, землі якой значна былі спустошаны і разрабаваны ў ходзе падзей Першай сусветнай вайны. Для вырашэння гэтых праблем напярэдадні канферэнцыі, 20–28 сакавіка 1922 г., у Лондане быў створаны Спецыяльны камітэт экспертаў. Вынікам яго працы стала прыняцце рэзалюцыі, у якой ад савецкага кіраўніцтва патрабавалася "прызнаць усе запазычанасці рэжымаў Расіі, прыняць адказнасць за ўсе страты, нанесеныя дзеяннямі савецкага і наступных урадаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі былой Расійскай імперыі" [2, с. 116].

У ходзе канферэнцыі савецкі бок выказаў гатоўнасць да абмеркавання пытання аб форме кампенсацыі былым замежным уладальнікам у Расіі пры ўмове прызнання Савецкай Расіі дэ-юрэ і прадстаўлення ёй крэдытаў. Акрамя таго, савецкай дэлегацыяй былі вылучаны контрпатрабаванні. Яны прадугледжвалі выплату на карысць РСФСР усіх страт, нанесеных савецкай дзяржаве падчас замежнай ваеннай інтэрвенцыі і польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. Савецкая дэлегацыя на першым пасяджэнні Генуэзскай канферэнцыі – 10 красавіка 1922 г. – унесла прапанову аб усеагульным разаружэнні. На жаль, якога-небудзь рашэння па ўзнятым пытанням не было прынята. Іх далейшы разгляд планаваўся ў рамках Гаагскай канферэнцыі (15 чэрвеня – 19 ліпеня 1922 г.).

Французскі ўрад падчас падрыхтоўкі да канферэнцыі дабіваўся ўмацавання антысавецкага блоку дзяржаў, таму 2 чэрвеня 1922 г. А. Пуанкарэ ў мемарандуме, накіраваным краінам Антанты і ЗША, настойваў на складанні спісу ўмоў, якія савецкі бок павінен будзе прыняць напярэдадні сустрэчы. Сярод гэтых умоў было прызнанне Савецкай Расіяй усіх ваенных і даваенных даўгоў і зварот нацыяналізаваных прадпрыемстваў іх былым замежным уладальнікам. Крэдыты маглі быць прадстаўлены толькі для ўзнаўлення сельскай гаспадаркі. Урад ЗША прыняў рашэнне не прымаць удзелу ў канферэнцыі. 16 мая 1922 г. Ч. Хьюз паведаміў міністру замежных спраў Італіі, што амерыканскі бок "не можа з карысцю прыняць удзел у Гаагскай канферэнцыі, якая будзе толькі працягам, хоць і пад іншай назвай, Генуэзскай канферэнцыі і непазбежна сутыкнецца з тымі ж цяжкасцямі, калі пазіцыя Савецкай Расіі, прадстаўленая ў мемарандуме ад 11 мая, застанецца нязменнай" [2, с. 134]. У наступныя тыдні ЗША імкнулася ўмацаваць у заходніх краінах пазіцыі праціўнікаў нармалізацыі адносін з савецкім бокам.

У працы Гаагскай канферэнцыі ўдзельнічалі прадстаўнікі дзяржаў – удзельніц Генуэзскай сустрэчы, за выключэннем Германіі. Савецкую дэлегацыю ўзначаліў М.М. Літвінаў. У адрозненне ад Генуі, асноўнымі дэлегатамі на Гаагскай канферэнцыі сталі прадстаўнікі дзелавых колаў (ад Вялікабрытаніі – міністр па справах знешняга гандлю Ф. Ллойд-Грым і былы дырэктар праўлення Руска-Азіяцкага банку, былы ўладальнік Кыштымскіх і Ленскіх руднікоў Л. Уркварт, ад Францыі – дырэктар Бюро аховы прыватнай уласнасці французскіх грамадзян у Расіі Л. Альфан).

26 чэрвеня на канферэнцыю прыехала савецкая дэлегацыя, праз дзень пачалі працаваць падкамісіі крэдытаў, даўгоў, прыватнай уласнасці. М. М. Літвінаў прапанаваў праект прадстаўлення Савецкай Расіі крэдытаў заходнімі краінамі на 1923–1925 гг. у агульнай суме 3 224 млн залатых рублей, пераважна ў таварнай форме. Акрамя таго, на пасяджэнні падкамісіі прыватнай уласнасці савецкая дэлегацыя агучыла спіс магчымых канцэсій для замежных прадстаўнікоў. У яго ўваходзілі нафтавыя, горныя, металургічныя, лясныя і некаторыя іншыя прадпрыемствы прамысловасці, а таксама сельскай гаспадаркі. Ён быў цалкам складзены з такім разлікам, каб захаваць у руках дзяржавы кіраўніцтва ў народнай гаспадарцы, але пры дапамозе канцэсій паскорыць узнаўленне шэрагу галін эканомікі. З боку краін Антанты не паступіла канкрэтных прапаноў.

19 ліпеня 1922 г. адбылося пленарнае пасяджэнне канферэнцыі, на якім савецкі бок пагадзіўся на выплату даваенных даўгоў, напрацягу двух гадоў дамовіцца з былымі замежнымі ўласнікамі аб прадстаўленні ім кампенсацыі, але пры ўмове прызнання Савецкай Расіі дэ-юрэ, і прадстаўленні ёй крэдытаў. Англійскі бок пагадзіўся на прыняцце савецкай прапановы, аднак французскі і бельгійскі прадстаўнікі адмовіліся. У выніку на наступны дзень была склікана так званая “нерuская” камісія, якая прыняла рэзалюцыю, што прадстаўленыя ў Гааге ўрады не павінны ўступаць у сепаратныя перагаворы з савецкім бокам адносна канцэсій і звароту замежным уладальнікам нацыяналізаванай маёмасці.

Нягледзячы на існаванне значнай колькасці спрэчных пытанняў у савецка-польскіх адносінах, у другой палове ліпеня – восенню 1922 г. праявілася тэндэнцыя да паляпшэння. Падчас працы Гаагскай канферэнцыі прадстаўнікі польскай дэлегацыі пайшлі на ўсталяванне непасрэдных кантактаў з савецкай дэлегацыяй яшчэ да яе пачатку. Краіны Антанты, улічваючы вопыт з заключэннем Рапальскага дагавора, прынялі рашэнне, якое забараняла асобным дэлегацыям уступаць у сепаратныя перагаворы і заключаць двухбаковыя дамовы з Савецкай Расіяй. Падчас сустрэч прадстаўнікоў польскай і савецкай дэлегацый у Гааге абмяркоўваліся пытанні наладжвання эканамічнага супрацоўніцтва. Польскі бок асабліва актыўна ўздымаў праблему мінімізацыі савецкай манаполіі знешняга гандлю.

Польскую дэлегацыю на Гаагскай канферэнцыі ўзначаліў буйны польскі эканаміст, віцэ-міністр прамысловасці і гандлю Г. Страсбургер. Ужо гэты факт яскрава дэманстраваў, што польскі бок рашуча настроены вырашыць усе спрэчныя фінансава-эканамічныя пытанні, якія ставілі перад Польшчай і Савецкай Расіяй. Таксама ў склад польскай дэлегацыі былі ўключаны эксперты па эканамічным пытанням. Акрамя гэтага, на Гаагскую

канферэнцыю паехалі: былы павераны Польшчы ў Маскве Т. Філіповіч, начальнік Усходняга аддзела Міністэрства замежных спраў Польшчы М.С. Касакоўскі, рэферэнт Міністэрства замежных спраў па рускім пытанням А. Залеўскі, прадстаўнік Польшчы ў рэпарацыйнай камісіі Ю. Мразоўскі, саветнік пасольства Польшчы ў Лондане Я. Цеханоўскі, пасланнік Польшчы ў Бельгіі В. Собаньскі і іншыя [3, с. 84].

У рамках Гаагскай канферэнцыі адбылося шэраг нефармальных сустрэч Г. Страсбургера з М. М. Літвінавым у гасцініце "Аранж", таксама пачаліся актыўныя гандлёвыя перагаворы дзелавых колаў Польшчы з членамі савецкай дэлегацыі. Актыўную ролю ў гэтым збліжэнні адыграў Е. Майер, Э. Розэ, Ю. Гусарскі – прадпрымальнікі, якія мелі добрыя эканамічныя сувязі ў былой Расійскай імперыі, добра ведалі расійскі рынак. Ю. Гусарскі актыўна выступаў у друку за заключэнне савецка-польскага гандлёвага дагавора, за эканамічнае супрацоўніцтва з гэтай краінай [5, с. 118].

Вынікам гэтых сустрэч стала двухбаковая сустрэча М.М. Літвінава – старшыні расійска-ўкраінскай дэлегацыі на Гаагскай канферэнцыі – з міністрам замежных спраў Польшчы Г. Нарутовічам і Ю. Пілсудскім. Яна адбылася ў Варшаве 4 жніўня 1922 г., падчас двухдзённага візіту савецкага прадстаўніка, па дарозе з Бельгіі ў Маскву. Падчас сустрэчы савецкі бок прапанаваў заключыць двухбаковы пакт аб узаемным супрацоўніцтве, ненападзенні і сяброўстве. Аднак Г. Нарутовіч даў зразумець М.М. Літвінаву, што гэтая прапанова з'яўляецца нецікавай для польскага кіраўніцтва. Фактычна адносіны паміж Польшчай і Савецкай Расіяй урэгуляваны пры дапамозе Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. Польскі бок, у сваю чаргу, настойваў на заключэнні гандлёвага дагавора і на дакладным выкананні савецкім кіраўніцтвам фінансава-эканамічных абавязкаў. Пасля візіту М.М. Літвінава ў Варшаву, Р. Кноль паведамляў у польскае Міністэрства замежных спраў 9 жніўня 1922 г., што савецкі ўрад мае намеры да збліжэння з Польшчай, яго падштурхоўваюць эканамічныя і палітычныя інтарэсы. Сапраўды, Савецкая Расія ў гэты час імкнулася не абвастраць адносіны з Польшчай [4, с. 78]. На пасяджэнні Палітбюро ЦК РКП(б) 21 верасня 1922 г. было вырашана не прадпрымаць якіх-небудзь дыпламатычных выступленняў з боку РСФСР ці УССР у сувязі з прынятымі польскімі ўладамі рашэннем аб уключэнні Усходняй Галіцыі ў склад Польскай дзяржавы [6, арк. 16–18].

Працягам варшаўскіх савецка-польскіх перагавораў стаў візіт Г.В. Чычэрына ў Варшаву. Народны камісар замежных спраў РСФСР, вяртаючыся з Берліна, дзе ён праходзіў лячэнне, сустрэўся з міністрам замежных спраў Г. Нарутовічам, прэм'ер-міністрам А. Новакам, Ю. Пілсудскім. Згодна з справаздачай Г.В. Чычэрына, асноўным пытаннем, якое абмяркоўвалася ў ходзе сустрэч стала заключэнне савецка-польскага гандлёвага дагавора [3, с. 169]. Савецкі бок патрабаваў, каб Польшча прызнала "манаполію знешняга гандлю". Польскае кіраўніцтва настойвала на абмежаванні дзяржаўнай манаполіі Савецкай Расіі на ажыццяўленне знешнегандлёвых мерыпры-емстваў. Гэты пункт фактычна стаў прычынай спынення савецка-польскіх перагавораў. Акрамя таго, было ўзнята пытанне склікання канферэнцыі па разбраенні. Польскае міністрэства замежных спраў паведамляла, што Г.В. Чычэрын акцэнтаваў увагу на мірныя памкненні савецкага боку і намагаўся пашырыць асновы для

мірнага супрацоўніцтва з Польшчай. Аднак, нягледзячы на адмоўны іх вынік, адзначаныя савецка-польскія стасункі сталі неабходнай базай для заключэння паштова-тэлеграфнай канвенцыі ў маі 1923 г. і актывізаваліся перагаворы па складанні санітарнай канвенцыі (падпісана 7 лютага 1923 г.). Таксама быў праведзены ў адпаведнасці з дадатковым пратаколам да Дагавора аб рэпатрыяцыі персанальны абмен у 300 чалавек [1, с. 514]. Узнавілі сваю працу Польска-расійска-ўкраінская рээвакуацыйная камісія і Узгадняльная камісія па ліквідацыі пагранічных інцыдэнтаў.

Такім чынам, нягледзячы на тое, што Гаагская канферэнцыя павінна была абмеркаваць прэтэнзіі краін Антанты да Савецкай дзяржавы, звязаныя з нацыяналізацыяй уласнасці замежных уласнікаў і ануляваннем даўгоў царскага, Часовага ўрада, пытанне аб крэдытах, па сутнасці, не было прынята ніякіх рашэнняў. Прадстаўнікі краін Антанты адвергнулі ўсе прапановы савецкай дэлегацыі, накіраваныя на міжнароднае супрацоўніцтва, адмовіліся абмяркоўваць пытанне аб крэдытах, настойвалі на звароце нацыяналізаванай маёмасці яго былым уладальнікам. Гэтыя патрабаванні савецкая дэлегацыя рашуча адхіліла. Перыяд правядзення канферэнцыі супаў з этапам нармалізацыі савецка-польскіх адносін, якія выліліся ў шматлікія двухбаковыя сустрэчы, у ходзе якіх былі заключаны паштова-тэлеграфная і санітарная канвенцыі.

*Крыніцы і літаратура:*

1. Документы внешней политики СССР: в 24 т. – Т. 3: 1 июля 1920 г. – 18 марта 1921 г. – М.: Госполитиздат, 1959. – 702 с.
2. Документы внешней политики СССР: в 24 т. – Т. 5: 1 января 1922 г. – 19 декабря 1922 г. – М.: Госполитиздат, 1961. – 786 с.
3. Документы и материалы по истории советско-польских отношений : в 11 т. / под ред. С. Вроньского. – М.: Изд-во АН СССР, 1965. – Т. 4: апрель 1921 г. – май 1926 г. – 560 с.
4. Мезга, Н.Н. Советско-польские отношения 1921–1926 годов: новый этап противостояния / Н.Н. Мезга ; Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2019. – 229 с.
5. Ольшанский, П.Н. Рижский договор и развитие советско-польских отношений 1921–1924 гг. / П.Н. Ольшанский. – М. : Наука, 1974. – 285 с.
6. Российский государственный архив социально-политической истории. – Ф. 17. Оп. 163. Д. 296.

## ПОЗИЦИЯ ВЕЛИКОБРИТАНИИ В ВОПРОСЕ О ПОЛОЖЕНИИ УКРАИНЦЕВ В ПОЛЬШЕ В ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ 1920-х гг.

Е.Н. Дубровко (Гомель)

В рамках становления Версальско-Вашингтонской системы международных отношений проходил процесс территориального оформления восточных границ Польши. Он завершился в марте 1923 г. подписанием решения Конференции послов союзных держав в Париже о международном признании этих границ по линии, обозначенной в тексте Рижского мирного договора 1921 г., и далее на север – по линии раздела нейтральной полосы между Польшей и Литвой, указанной Советом Лиги наций 3 февраля 1923 г. [1].